Источник: "Краязнаўчая газета" - 2014-02-20

# Патрыярх нашай гісторыі

***Запрашаем чытачоў «Краязнаўчай газеты» ў Цэнтральную навуковую бібліятэку НАН Беларусі, дзе 12 лютага з 85-гадовым юбілеем віншавалі слыннага гісторыка і нашага пастаяннага аўтара – Леаніда Міхайлавіча Лыча.***

Пра сваё маленства, шлях да зацікаўленасці гісторыяй, пра стаўленне да беларускай мовы і яшчэ шмат пра што расказваў у той вечар Леанід Міхайлавіч. Чаго толькі вартыя, да прыкладу, такія ўспаміны:

– …Пасля таго як мяне прынялі ў піянеры, я перастаў курыць. І бацька тады ўжо казаў: «Усё, ён болей не курыць».

…Калі трэба было паступаць вучыцца, я затрымаўся, таму пайшоў туды, дзе быў недабор, – у статыстычны тэхнікум. Помню, хадзіў па вёсцы і пытаў у людзей, што такое статыстыка. Праўда, ніхто гэтага не ведаў.

…Пад час вучобы студэнты неяк узнялі пытанне, чаму ў тэхнікуме няма ніводнага прадмета на беларускай мове. І тады выкладчыца рускай мовы спецыяльна знайшла час, каб прачытаць нам лекцыю пра значэнне рускай мовы ў жыцці, пра тое, што яна дае выхад у вышэйшую культуру…



Прагучала пад час імпрэзы і амаль сенсацыйнае прызнанне – Леанід Міхайлавіч расказаў тое, што не казаў яшчэ нікому. Паводле яго словаў, у свой час ён служыў у сістэме Міністэрства ўнутраных спраў, абслугоўваў лагер палітзняволеных. Праўда, больш за ўсё ён казаў пра тых, хто працаваў разам з ім: *«І там былі вартыя людзі, якім было няпроста. Хтосьці пачынаў піць, адзін нават скончыў жыццё самагубствам… А я пры першай магчымасці звольніўся»*.

Завочна Леанід Міхайлавіч вучыўся ў Башкірскім педагагічным універсітэце, але праз некаторы час адчуў, што павінен ехаць на радзіму. У 1962 годзе пачаўся яго шлях у навуку. І шлях гэты быў болей чым паспяховым. Патрыярхам гістарычнай навукі – разам з гісторыкам Анатолем Грыцкевічам – назваў Леаніда Лыча пад час імпрэзы доктар гістарычных навук Эмануіл Іофе.



*Юбіляра віншуе мастак Алесь Цыркуноў*

За руплівасць на ніве не толькі беларускай гісторыі Леаніду Міхайлавічу дзякавалі акадэмік-сакратар НАН Беларусі доктар гістарычных навук Аляксандр Каваленя, старшыня Мінскага гарадскога аб'яднання ўкраінцаў «Заповіт» Галіна Калюжная і муфцій беларускіх татараў Абу-Бекір Шабановіч. Шчырыя віншаванні ў адрас юбіляра выказалі Васіль Якавенка, Анатоль Валахановіч, Радзім Гарэцкі, Уладзімір Ліпскі ды іншыя калегі і сябры Леаніда Міхайлавіча.

***Ніна КАЗЛЕНЯ***
***Фота***
***Наталі КУПРЭВІЧ***

Ніна Казленя. Патрыярх нашай гісторыі